система. — URL: https://e.lanbook.com/journal/issue/313984 (дата обращения: 07.03.2023). — Режим доступа: для авториз. пользователей.
3. Снежицкий, П. В. Биосоциальный аспект двигательной культуры в генезисе здоровьесозидающей функции личности / П. В. Снежицкий / Мир спорта. – 2021. – С. 44 – 49.

УДК 37.018.5.

# ПРАКТЫКА-МЕТАДЫЧНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ АРГАНІЗАЦЫІ ФІЗІЧНАГА ВЫХАВАННЯ СТУДЭНТАЎ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА МЕДЫЦЫНСКАГА ЎНІВЕРСІТЭТА

**В.У Грыгарэвіч[1], П.У. Сняжыцкі[2]**
[1)]УА «Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт» (Рэспубліка Беларусь, 230009, г. Гродна, вул. Горкага, 80; email: sport-grsmu@mail.ru)
[2)]УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт» (Рэспубліка Беларусь, 230008, г. Гродна, вул. Церашковай, 28; email: ggau@ggau.by)

Анатацыя: У артыкуле разглядаюцца асаблівасці арганізацыі фізічнага выхавання студэнтаў асноўнага і падрыхтоўчага навучальных аддзяленняў, прыводзяцца вынікі маніторынгавага даследавання «кафедра фізвыхавання вачыма студэнтаў», аналізуюцца перспектывы паляпшэння вучэбна-педагагічнага працэсу ў ВНУ.
Ключавыя словы: фізічнае выхаванне, студэнты, асаблівасці арганізацыі, перспектывы паляпшэння.

# PRACTICAL AND METHODOLOGICAL FEATURES ORGANIZATION OF PHYSICAL EDUCATION OF STUDENTS OF HRODEN STATE MEDICAL UNIVERSITY

**V.V. Grigorevich**[1], **P.V. Snezhitsky**[2]
[1)]EI «Grodno State Medical University» (Republic of Belarus, 230009, Grodno, 80 Gorkaho Street; email: sport-grsmu@mail.ru)
[2)]EI «Grodno State Agrarian University» (Republic of Belarus, 230008, Grodno, Terashkova Street, 28; email: ggau@ggau.by)

Summary. The article examines the peculiarities of the organization of physical education of students of basic and preparatory educational departments, gives the results of the monitoring study «Department of physical education through the eyes of students», analyzes the prospects for improving the educational and pedagogical process in universities.
Key words: physical education, students, features of the organization, prospects for improvement.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

Фізічнае выхаванне ў Гродзенскім дзяржаўным медыцынскім універсітэце (ГрДМУ) ажыццяўляецца ў адпаведнасці з нарматыўнымі дакументамі, якія рэгламентуюць арганізацыю заняткаў па дысцыпліне «Фізічная культура» ў Рэспубліцы Беларусь [1]. Дадзеная дысцыпліна выкладаецца на 1-4 курсах усіх факультэтаў (за выключэннем факультэта замежных навучэнцаў) у аб'ёме 4-х гадзін у тыдзень па раскладзе вучэбна-метадычнага аддзела універсітэта. На старэйшых курсах (3-4-х) адзін занятак (2-х гадзіннае) праводзіцца па агульнаўніверсітэцкім раскладзе, а другі занятак у тыдзень праводзіцца ў рамках кіраванай самастойнай работы студэнтаў [2].

Безумоўна, абавязковай умовай для разнастайных інавацый, паляпшэнняў педагагічнага працэсу з'яўляецца наяўнасць адпаведнай матэрыяльна-спартыўнай базы. У ГрДМУ для правядзення заняткаў па фізічнай культуры маюцца два спартыўных залы памерам 36х18м, адзін спартыўны зал памерам 24х12м, а таксама тры прыстасаваных памяшкання. Агульная плошча крытых спартыўных збудаванняў 2264 м$^2$, што складае 0,69 м$^2$ на аднаго студэнта, якія займаюцца па дысцыпліне «Фізічная культура». Згодна нарматывам Дзяржаўных сацыяльных стандартаў па абслугоўванню насельніцтва Рэспублікі Беларусь гэты паказчык для навучэнцаў сярэдніх школ і ліцеяў складае 0,5 м$^2$. Для ВНУ асобных нарматываў не прадуглежана.

Акрамя гэтага маюцца адкрытыя спартыўныя пляцоўкі (уведзены ў карыстанне ў пачатку 2020 года) каля інтэрната № 4 (вул. Курчатава, 10) – валейбольная, баскетбольная і пляцоўка для міні-футбола, агульная плошчай 1327,4 м$^2$, альбо 0,40 м$^2$ на аднаго студэнта 1-4 курсаў, займаючыхся па дысыпліне «Фізічная культура». Сацыяльныя стандарты прадугледжваюць 1,62 м$^2$ на аднаго чалавека. Гэта накладвае свой адбітак на арганізацыю фізічнага выхавання. У спрыяльных умовах надвор'я (верасень, май месяцы) заняткі праводзяцца таксама ў блізкіх паркавых зонах горада, у іншы час (кастрычнік-красавік) - на наяўнай уласнай крытай спартыўнай базе.

Правядзенне заняткаў праводзіцца па гендэрнай прыкмеце на розных спартыўных базах. Разам з тым, так як навучальныя заняткі праводзяцца з 8 гадзін 30 мін. да 17-і гадзін, адсутнічае практычная магчымасць для паасобнага правядзення заняткаў у асноўным і падрыхтоўчым навучальным аддзяленнях. Пры гэтым для студэнтаў, аднесеных да падрыхтоўчай медыцынскай групы, прадастаўляецца магчымасць індывідуальнай дазіроўкі фізічных практыкаванняў, нагрузкі, а таксама абмежаванні пры здачы нарматываў па фізічнай падрыхтоўцы [3].

Па стане на 1.10.2022 г. фізічным выхаваннем на 1-4 курсах было ахоплена 2473 чалавекі, з іх 1838 чалавекі або 74,3% дзяўчыны. Да асноўнай медыцынскай групы аднесена 1712 чал. (69,2%), падрыхтоўчай медыцынскай групе – 289 чал. (10,9%) і да спецыяльнага навучальнага аддзялення (уключаючы студэнтаў, якія адносяцца да групы лячэбнай фізічнай культуры) – 492 чал. (19,9%).

У змест заняткаў уваходзяць сродкі спартыўных і рухомых гульняў. Для дзяўчат у восеньскім семестры прымяняюцца рухомыя гульні, гульні з элементамі гандбола, баскетбола, у вясновым семестры – заняткі валейболам. Акрамя гэтага структура кожнага асобнага занятка для дзяўчат ўключае ў сябе агульную падрыхтоўчую частку (30-35 мін.), потым студэнты дзеляцца на дзве роўныя групы, адна з якіх у спартыўнай зале займаецца спартыўнымі або рухомымі гульнямі, а другая займаецца ў прыстасаваным спартыўным памяшканні на трэнажорах. Праз пэўны час (25 мін.) групы мяняюцца месцамі правядзення заняткаў, што дае магчымасць на працягу аднаго занятку разнастаіць змест і форму.

У юнакоў першая частка занятка праводзіцца ў выглядзе агульнай фізічнай падрыхтоўкі з вялікай доляй сілавой падрыхтоўкі, а другая частка занятка напаўняецца спартыўнымі гульнямі: у восенскім семестры – гандболам і баскетболам, у вясеннім семестры – валейболам і міні-футболам.

З мэтай вывучэння задаволенасці студэнтаў арганізацыяй фізічнага выхавання ў снежні 2022г. было праведзена маніторынгавае даследаванне «Кафедра фізічнага выхавання вачыма студэнтаў». Аб'ектам даследавання выступілі студэнты 2-х і 4-х курсаў усіх факультэтаў УА «ГрДМУ». Выбарка склала 368 рэспандэнтаў 2 курса (76% ад агульнай колькасці студэнтаў) і 405 рэспандэнтаў 4 курса (67% ад агульнай колькасці).

На пытанне «Ці задавальняе вас методыка правядзення заняткаў» 87,5% студэнтаў 2 курса і 82,2% студэнтаў 4 курса адказалі «Цалкам задавальняе ці ў цэлым задавальняе». І толькі 2,7% студэнтаў 2 курса і 5,2% студэнтаў 4 курса сказалі, што іх наогул не задавальняе методыка правядзення заняткаў.

На пытанне «Ці задавальняе вас якасць заняткаў» 89,6% студэнтаў 2 курса і 82,5% студэнтаў 4 курса адказалі станоўча і толькі 2,5% студэнтаў 2 курса і 4,4% студэнтаў 4 курса не задаволеныя якасцю заняткаў.

Таксама высока ацанілі рэспандэнты стаўленне выкладчыкаў да студэнтаў на занятках – 92,7% другакурснікаў і 85,5%

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

чацверакурснікаў. І толькі 2,7% другакурснікаў і 3,7% чацвяракурснікаў не задаволеныя стаўленнем выкладчыкаў да іх.

Дастаткова высока (86,4% другакурснікаў і 80,7% чацвяракурснікаў) ацанілі атмасферу і мікраклімат падчас заняткаў па фізічнай культуры. Асоб, якіх наогул нічога не задавальняе, аказалася 1,1% студэнтаў 2 курса і 3% студэнтаў 4 курса.

Частка пытанняў анкеты тычылася магчымасцяў студэнтаў займацца ў спартыўных секцыях. У УА «ГрДМУ» арганізавана работа 16 спартыўных секцый у рамках спартыўнага навучальнага аддзялення, у якіх займаецца 209 студэнтаў.

На пытанне «Ці ведаеце вы пра магчымасці студэнтаў займацца ў розных спартыўных секцыях» 91,3% студэнтаў 2 курса адказалі сцвярджальна, 4,3% адзначылі, што не цікавіліся гэтым пытаннем і таксама 4,3% адказалі, што не ведаюць пра такія магчымасці.

Цікавыя вынікі атрымалі пры адказе на пытанне «З якімі цяжкасцямі вы сутыкнуліся пры запісе ў спартыўную секцыю» 72,5% другакурснікаў і 67,4% чацвяркурснікаў адказалі, што яны не спрабавалі запісвацца ў спартыўную секцыю, бо ім гэта не цікава.

Гэтыя дадзеныя ў значнай ступені адрозніваюцца з укаранелым меркаваннем аб пажаданасці арганізацыі фізічнага выхавання студэнтаў праз павелічэнне колькасці розных секцый, тым больш ва ўмовах дэфіцыту крытых спартыўных збудаванняў.

Варта адзначыць, што 79% студэнтаў 2 курса і 74% студэнтаў 4 курса адгукнуліся станоўча аб матэрыяльна-тэхнічным аснашчэнні спартыўных залаў ВНУ.

Таксама безумоўны інтарэс выклікае меркаванне студэнтаў аб паляпшэнні працэсу фізічнага выхавання. Сярод іх досыць прадуктыўных жаданняў, такіх як: заняткі танцамі, фітнесам, ёгай, плаваннем, аэробікай, музычнае суправаджэнне заняткаў.

Разам з тым былі выказванні часткі студэнтаў, асабліва старэйшых курсаў, пра не абавязковым наведванні заняткаў, памяншэнні часу, выгоды раскладу і нават аб адмене заняткаў на 3-4 курсах.

На жаль, усе гэтыя пажаданні ўпіраюцца ў магчымасці матэрыяльна-тэхнічнай базы, якая ў прынцыпе павінна быць падмуркам інавацый спартыўна-масавай і вучэбнай працы па фізічным выхаванні ў ВНУ.

ЛІТАРАТУРА

1. Физическая культура: типовая учебная программа для учреждений высшего образования. – Минск: БГУ, – 2017. – 33 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГМУ

2. Жадько, Д.Д. Самостоятельная работа студентов по физической культуре в учреждениях высшего образования: учеб. пособие / Д.Д. Жадько, В.В. Григоревич, Н.А. Кандаракова. – Гродно: ГрГМУ, 2020. – 208 с.
3. Жадько, Д.Д. Сравнительная характеристика динамики физической подготовленности студентов учреждения образования «Гродненский государственный медицинский университет» в течение учебного года / Д.Д. Жадько, В.В. Григоревич // Веснік Мазырскага дзярж. пед. ун-та імя І.П. Шамякіна. – 2017. – №2(50). – С.63-71.

УДК 613.71-057.87:[378.4:61](476.6)

## ФИЗИЧЕСКОЕ СОСТОЯНИЕ СТУДЕНТОВ СПЕЦИАЛЬНОГО УЧЕБНОГО ОТДЕЛЕНИЯ УО «ГРГМУ»

**Н.А. Кандаракова[1], Т.В. Хонякова[1], О.Н. Озимко[1], П.В. Снежицкий[2]**
[1)]УО «Гродненский государственный медицинский университет» (Республика Беларусь, 230009, г. Гродно, ул. Горького, 80; e-mail: mailbox@grsmu.by)
[2)]УО «Гродненский государственный аграрный университет» (Республика Беларусь, 230008, г. Гродно, ул. Терешковой, 28; e-mail: ggau@ggau.by)

Аннотация. В статье представлены результаты антропометрического и физиометрического обследований студентов, занимающихся в специальных медицинских группах, характеризующие их функциональное состояние.
Ключевые слова: студенты, специальные медицинские группы, двигательно-культурная деятельность.

## PHYSICAL CONDITION OF STUDENTS OF THE SPECIAL EDUCATIONAL DEPARTMENT OF EE «GRGMU»

**N.A. Kandarakova[1], T.V. Khonyakova[1], O.N. Ozimko[1], P.V. Sniazhytski[2]**
[1)]EI «Grodno State Medical University» (Belarus, Grodno, 230009, 80 Gorkogo st.; e-mail: mailbox@grsmu.by)
[2)]EI «Grodno State Agrarian University» (Belarus, Grodno, 230008, 28 Tereshkova st.; e-mail: ggau@ggau.by)

Summary. The article presents the results of anthropometric and physiometric examinations of students involved in special medical groups, characterizing their functional state.
Key words: students, special medical groups, movement and cultural activities.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ